
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 24(461) 21 ЧЭРВЕНЯ 2000 г.

Першая камунія ў касцёле Св. Барталамея



Напярэдадні дня дзіцяці ў беларускім касцёле ў Вільні Святога Барталамея вучні беларускай школы імя Фр.Скарыны бралі першую камунію. На працягу года да гэтай урачыстасці іх рыхтавала сястра Наталля. Кожную сераду ў школе яна вучыла іх рэлігіі, у нядзелю разам былі на святой імшы ў касцёле, многія вучні спяваюць у хоры. З гэтага дня ў іх душах Бог, з яго ласкі яны будуць жыць, вучыцца, выбіраць жыццёвыя шляхі. Такое бывае раз у жыцці. Дзевяць вучняў: Ганна Быкава, Каця Варановіч, Наташа Верацэннікава, Таня і Наташа Кавальчукі, Алег Раманчук, Саша Суркоў, Марык і Дарык Сасноўскія ўпершыню ў гісторыі прымалі першую камунію на беларускай мове.

Іх віншавалі ксёндз Ян Шуткевіч, настаўнікі школы, бацькі, сваякі.

Леакадзія Мілаш, г.Вільня.

Наша колькасць зноў павялічылася

На апошнім пасяджэнні Сакратарыята ТБМ 1 чэрвеня была зарэгістраваная Пухавіцкая раённая арганізацыя ТБМ (старшыня рады – Уладзімір Шаўняк – навучэнец Менскага машынабудаўнічага каледжу, які стала жыве ў Мар'інай Горцы), а таксама Нарачская вучнёвая суполка ТБМ з Вілейскага р-на.

Таксама ў ТБМ уступілі вучні 9 і 10 класаў школ " 199, 193, 217 і 97 г. Менска.

20 красавіка 2000 г. пастаўлена на ўлік Ушацкая раённая арганізацыя ТБМ. Віншуем!

Сакратарыят.

Прайшлі перарэгістрацыю ў мясцовых райвыканкамах Полацкая раённая і Гарадоцкая раённая арганізацыі ТБМ.

Віншуем! **Сакратарыят.**

Гарадзенская абласная канферэнцыя ТБМ

25 чэрвеня 2000 г. аб 11 гадзіне ў Горадні адбудзецца абласная канферэнцыя Грамадскага аб'яднання "ТБМ імя Ф.Скарыны".

Пытанні канферэнцыі:

1.Вынікі рэгістрацыі суполак.

2.Аб рабоце суполак па падпісцы газеты "Наша слова".

3.Выбары дэлегатаў на Усебеларускі з'езд (29.07.2000 г.).

4.Выбары дэлегатаў на III кангрэс дэмакратычных сілаў (2.07.2000 г.).

5.Рознае.

У рабоце канферэнцыі прыме ўдзел старшыня Рэспублікан-скай рады ТБМ імя Ф.Скарыны А.А.Трусаў.

Кіраўнікі суполак атрымаюць кнігі для сваіх сяброў.

Праезд аплочваецца ў абодва бакі.

Тэлефон для даведак: хат. 31-53-78 пасля 18.00.

Старшыня абласнога грамадскага аб'яднання ТБМ імя Ф.Скарыны А.І. Місцюкевіч.

Падпіска на "Наша Слова" будзе доўжыцца да верасня.

Паважаныя сябры і прыхільнікі ТБМ! Ад Вас, шаноўнае спадарства залежыць ці будзе існаваць нашая газета далей ці не.

Каб газета існавала нармальна нам трэба 5000 падпісчыкаў, а зараз мы маем каля 2000 . Арыфметыка тут простая. Кожны сябра ТБМ проста абавязаны падпісацца на сваю газету, бо сумма меншая за 1000 рублёў за паўгода падпіскі невялікая і кожнаму па кішэні. Таму мы просім усіх актывістаў ТБМ на працягу не толькі чэрвеня, але і ўсяго лета займацца і яшчэ раз займацца падпіскай. Дарэчы толькі ТБМ гарантуе кожнаму падпісчыку на паўгоддзе бясплатна добрую беларус-кую кніжку. Таму за справу сябры!

Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

"Рэлігіязнаўства" па-беларуску

Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі РБ у 2000 г. запланавана выданне вучэбнага дапаможніка "Рэлігіязнаўства" дацэнта кафедры беларускай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны Адзіночанкі В.А.

Аб'ём 13,5 друкаваных аркушаў. Мова выдання – беларуская.

Вучэбны дапаможнік прызначаны для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў, дзе вывучаецца рэлігіязнаўства. Таксама можа выкарыстоўвацца настаўнікамі гісторыі сярэдніх школ.

У дапаможніку разглядаюцца пытанні сутнасці рэлігіі і вальнадумства, прычыны іх узнікнення і месца ў культуры. Асноўная ўвага нададзена выкладанню гісторыі розных рэлігійных канфесій. Прыведзены матэрыял па гісторыі рэлігіі і вальнадумства на Беларусі.

Дапаможнік напісаны ў адпаведнасці з зацверджанай Міністэрствам адукацыі Прыкладнай праграмай па рэлігіязнаўству, адным з распрацоўшчыкаў якой з'яўляецца В.Адзіночанка.

Замовы трэба накіроўваць на адрас: аддзел маркетынгу, Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі, вул. Б.Хмяльніцкага, 3, 220013, Менск.

Замова ад арганізацыі павінна быць замацавана подпісамі кіраўніка, галоўнага бухгалтара і пячаткай.

Заканчваюцца выпускныя экзамены

А ў першы дзень экзаменаў сто дзевяць навучэнцаў дзевятых класаў СШ №2 г. Менска трымалі пісьмовы экзамен на беларускай мове. У гэты дзень разам са сваімі вучнямі хвалявалася і настаўніца беларускай мовы Наталля Аляксандраўна Штанюк. Для яе, былой выпускніцы гэтай школы, быў першы экзамен на трываласць ведаў яе вучняў.

На здымку: настаўніца беларускай мовы Наталля Аляксандраўна Штанюк і яе вучні на экзамене.

Фота Яўгена Казюлі, БелТА.



Ахвяраванні на ТБМ

1.Хахлоў Станіслаў (Чэрыкаўская гарадская арганізацыя ТБМ) – 500 руб.
2.Шчэрбіч Мікола (Чэрыкаўская гарадская арганізацыя ТБМ) – 500 руб.
3.Дарафееў Усевалад (Чэрыкаўская гарадская арганізацыя ТБМ) – 500 руб.
4.Салдаценка Ігар (Чэрыкаўская гарадская арганізацыя ТБМ) – 500 руб.
5.Кажан Віталь, ЗША – 100 $
6.Станкевіч Вячка – 4 $

Дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны па наданні роднай мове рэальнага статуса дзяржаўнай вымагае вялікіх выдаткаў. Падтрымаць ТБМ – справа гонару кожнага грамадзяніна краіны.


Просім Вашыя ахвяраванні дасылаць на адрас: вул. Румянцава 13, г.Менск, 220005, альбо пералічыць на разліковы рахунак ТБМ № 3015212330014 у Менскай гардырэкцыі ААТ Белбізнесбанка код 764 праз любое аддзяленне ашчадбанка Беларусбанк (камісійны збор пры гэтым не бярэцца).

Ліда. Сабрана больш 8000 подпісаў за БНУ

20 чэрвеня ў Лідзе закончаны збор подпісаў за Беларускі Нацыянальны Універсітэт. Усяго сабрана 8047 подпісаў. Тарэса Карэйва адна сабрала 1097 подпісаў, за што ўжо ўзнагароджана ад імя Сакратарыяту кнігай "Аняменне". Такога масавага збору подпісаў Ліда яшчэ не бачыла.

Вяртанне Метрыкі

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 28 (1522-1552гг.). Кніга запісаў 28 /Падрыхтоўка тэкстаў да друку і навук. аппарат: Валеры Мяжынскі, Уладзімір Свяжынскі – Менск: ATHENAEUM, 2000. – 312 с.:іл. – (Калекцыя "Помнікі", Том І)



Упершыню пасля 1928 году ў Беларусі аднаўляецца традыцыя публікацыі Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Нагадаем, што з таго часу, як у 1978 г. быў сфармуляваны міжнародны праект, а ў 1980 г. падпісаны рабочы план выдання Метрыкі, выйшлі 2 кнігі ў Польшчы, 12 ў Літве, 1 ва Украіне. Нарэшце, з'явілася першая беларуская публікацыя ў рамках міжнароднага праекту па даследаванню і выданню Метрыкі ВКЛ. Агульны аб'ём Метрыкі – 662 тамы, так што працы для міжнароднага калектыву даследчыкаў хопіць на многія дзесяцігоддзі.

Метрыка – гэта ўнікальны корпус крыніцаў па гісторыі Беларусі, Літвы, Украіны ды ўсяго нашага рэгіёну Еўропы. У Метрыку на працягу ХУ –ХУІІІ стст. уносіліся копіі ўсіх дакументаў якія сыходзілі ад імя вялікага князя, Рады і соймаў ВКЛ, а гэта дакументы па палітычнай, дыпламатычнай, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, а таксама па гісторыі культуры і гісторыі населеных пунктаў. У параўнанні з Метрыкаю не існуе іншых збораў рукапісных тэкстаў, дзе бы так поўна, падрабязна, дэталявана ды рознабакова было адлюстравана жыццё Вялікага Княства. Не столькі гісторыя, як менавіта жыццё, якое зафіксавана ў вялікакняскіх прывілеях, судовых выраках, шляхецкіх тастамантах... Нават тэксты міждзяржаўных дамоваў маюць адбітак псіхалагічнага ці настраёвага складу ліцвінскага пісара. Кожнае скарачэннее ў тэксце, кожная вынаска над радком, кожная памылка – факт жыцця Вялікага Княства. Бальшыня гістарыяграфічных праблемаў ВКЛ можа быць вырашаная, калі часцей звяртацца да гэтага аўтэнтычнага твору – Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага.

У Кнізе № 28 Метрыкі ВКЛ прадстаўлены матэрыялы, якія датычаць Вільні, Менска, Полацка, Воршы, Горадні, Мсціслава, Кіева і іншых мясцінаў Беларусі ды усяго Вялікага Княства Літоўскага. На працягу 1522 – 1552 гг. Дакументы публікуюцца ў мове арыгіналу- старабеларускай. Кніга забяспечаная дэталёвымі ўводзінамі на беларускай, расійскай, англійскай, літоўскай мовах, а таксама вялікім навукова-даведачным апаратам, падрыхтаваным паводле крытэрыяў міжнароднай праграмы па даследаванню і выданню Метрыкі ВКЛ.

У Беларусі праект выдання Метрыкі стаўся грамадзянскаю акцыяй, што аб'яднала даследчыкаў, якія працуюць у дзяржаўных навуковых інстытуцыях, ды прыватных выдавецкіх ініцыятываў. Праца была выкананая ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі гісторыкам Валерыем Мянжынскім і філолагам Уладзімірам Свяжынскім. Выданне ажыцьцёўлена альманахам гісторыі і культуры "Athenaeum".Цяпер вядзецца падрыхтоўка да выпуску электроннай версіі Кнігі № 28 Метрыкі ВКЛ на кампакт-дыску, што будзе асабліва зручным для бібліятэкаў і універсітэтаў па ўсім свеце.

"Athenaeum" у супрацоўніцтве з навукоўцамі Інстытута гісторыі падыходзіць да новага праекту, звязанага з Метрыкаю – выдання альманаха "Metriciana. Даследаванні Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага". Такім чынам, у навукоўцаў з'явіцца магчымасць рыхтаваць да публікацыі як самі крыніцы, так і даследчыя працы па Метрыцы. Першы нумар "Метрыкіаны" выйдзе ўжо ў восень 2000 г.

Усю другую палову вясны аўтар кнігі і выдавец занятыя арганізацыя па Беларусі акцыяў "Цывілізацыя Метрыкі". Самой назвай арганізатары падкрэсліваюць, што з пункту гледжання крыніцаў Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае можа назваць Цывілізацыяй Метрыкі. Мэтай акцыяў з'ўляецца не толькі прэзентацыя выдадзенай кнігі, але прыцягненне беларускага грамадства да самай поўнай крыніцы па гісторыі Беларусі – Метрыкі ВКЛ, так незалужана пазабытай ў Беларусі апошніх дзесяцігоддзяў. 25 красавіка акцыя "Цывілізацыя Метрыкі" адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (там адначасова была адкрыта кніжная выстава "Выданне Метрыкі ВКЛ"), а 11 траўня – у Віцебскім Дзяржаўным Універсітэце.


Цяпер можна сцвярджаць – Метрыка вяртаецца да законных спадкаемцаў гістарычнай і культурнай традыцыі Вялікага Княства.

Алег Дзярновіч, каардынатар выдання Метрыкі ВКЛ.

Крыж памяці

кароткі спіс войнаў, бітваў, паўстанняў, катастрофаў, якія выпалі на лёс Беларусі за тысячагоддзе

"Кароткі спіс..." ахоплівае тысячагоддзе беларускай гісторыі. Ён адкрываецца спаленнем Полацка ў 980 годзе і спыняецца на вайне ў Афганістане, дзе з 1979 па 1989 год загінула і было паранена шмат беларусаў, прызваных у Савецкую Армію. "Спіс...", зразумела, няпоўны, бо шмат войнаў і паўстанняў пазначаны ў ім адным радком, хоць змяшчаюць мноства ваенных падзеяў. Толькі 628 беларускіх вёсак, спаленых карнікамі разам з людзьмі ў 1941-1944 гадах, могуць скласці асобную кнігу смутку. А такіх вёсак і мястэчак за сваю гісторыю Беларусь ведае тысячы.



Вайна, праз якую Расія у 1654-1667 гадах імкнулася падпарадкаваць беларускія землі, складалася з сотняў буйных і малых бітваў, сутычак, аблогаў, спалення гарадоў, вынішчэння вёсак. Тое ж тычыцца і Паўночнай вайны, міжусобных і грамадзянскіх войнаў. За кожным радком "Спісу..." ахвяраваныя радзіме жыцці герояў, загубленыя жыцці мірных жыхароў, плач удоў і сіротаў.

Часцяком беларусы апыналіся ў варожых войсках і забівалі брат брата; напрыклад, у французскім і расійскім (вайна 1812 г.), у польскім і савецкім войсках (вайна 1939 г.), у палках Вітаўта і Ягайлы падчас іхнай міжусобіцы, у харугвах Сапегаў ці варожых ім аддзелах Радзівілаў.

Нашая гістарычная навука не займалася дакладным падлікамі беларускіх рэкрутаў у расійскім войску ў ХІХ і ХХ стагоддзях ды адпаведна не вызначыла іхні колькасны ўдзел падчас імперскіх войнаў на Каўказе, у Сярэдняй Азіі, у Крымскай і другіх войнах. Нідзе, здаецца, не публікаваліся і лічбы, якія асвятлялі б колькасць беларускіх салдатаў, палеглых пры ўзяцці Кёнігсберга, на Зеялаўскіх вышынях падчас Берлінскай аперацыі і г.д.

Так склалася, што страты насельніцтва і беларускіх ваяроў, адзначаны ў асноўным помнікамі толькі пасля апошняй вайны. Зрэдку захаваліся помнікі з мінулых часоў. У апошні час устаноўлены сціплыя мемарыяльныя знакі, звязаныя з перамогамі беларускіх ваяроў над крыжакамі, крымскімі татарамі, маскоўцамі. Устаноўлены некалькі памятных знакаў (крыжоў) у гонар паўстанцаў 1863-1864 і 1920 гадоў, ахвяраў сталінскага генацыду ў Курапатах, Лошыцы ды іншых месцах. Нейкім цудам захаваліся некалькі магілкаў з Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Ёсць асобныя пахаванні ўдзельнікаў вайны 1812 года. Аднак у большасці выпадкаў па традыцыі на брацкіх магілах насыпалі курган, ды наступныя пакаленні ўжо не ведалі хто спіць пад зялёным дзірваном. Пасля паўстанняў ХІХ стагоддзя, мноства касцёлаў, дзе ў склепах вялізя фамільныя пахаванні, былі перароблены ў праваслаўныя цэрквы. Няма следу ад пахаванняў Сапегаў, Агінскіх, Гальшанскіх. Тайна абкружвае месца пахавання Кастуся Каліноўскага і мноства іншых растраляных ці палеглых у баях паўстанцаў. Родавыя капліцы пры сядзібах амаль усе разрабаваныя ў гады вайны і пасля яе ў часы "выкаранення рэлігійных перажыткаў". Мала засталося ў нас і старых гарадскіх могілкаў. Таму кожнае захаванне, якое ўцалела, павінна займець грамадскую ўвагу.

"Спіс..." праілюстраваны эскізамі помнікаў у гонар вядомых абаронцаў радзімы і прынятых народам Беларусі пакут, якія, на думку, стваральнікаў гэтай кнігі, павінны стаяць на нашай зямлі. Канкрэтны іх вобраз, зразумела, мае вырашацца на творчых конкурсах. На апошняй старонцы вокладкі падаецца эскізная прапанова Магілы Невядомага Салдата, якая можа быць размешчана ў Мінску ў скверы насупроць Дома афіцэраў.

Алег Трусаў, кандыдат гістарычных навук, Старшыня Таварыства беларускай мовы

Полацкая вандроўка

У адну з вясновых нядзель, калі надвор'е было добрае, мы разам з сябрамі выправіліся ў Полацк. Ужо даўно мы марылі пабываць у самым старажытным беларускім горадзе, і ўрэшце нашы мары здзейсніліся. Мы шмат дзе пабылі і шмат чаго пабачылі. Былі ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры і ў славутай Полацкай Сафіі, бачылі Барысаў камень і вал Івана Жахлівага, наведалі амаль усе музеі Полацка. І з усіх гэтых музеяў (а іх каля шасці) спадабаўся больш за ўсё адзін, нават не музей, а выстава, якая месціцца ў "доміку Пятра І", помніку архітэктуры ХУІІ ст. Па мясцовых паданнях у гэтым будынку спыняўся Пётр І, калі быў у Полацку, але, як нам патлумачыла супрацоўніца музея, гэта не зусім так. Пётр І мог увогуле і не бываць у гэтым доме, але ж паданне ёсць паданне.

Сама выстава прысвечана зусім не асобе Пятра. Называецца яна "Прагулка па Ніжнепакроўскай" і распавядае пра гісторыю вуліцы.

Ідэя выставы – расказаць пра вуліцу Ніжнепакроўскую (сучасная вул. Леніна), якой яна была ў канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. Дарэчы, гэта першая такая выстава на Беларусі. Сама ідэя выставы вырашана даволі цікава. У невялікім пакойчыку музея, як бы змясцілася частка вуліцы.

Пачынаецца экспазіцыя тумбай з афішамі і аб'явамі канца ХІХ – пачатку ХХ ст., а потым наведвальнікі трапляюць быццам бы на саму тагачасную вуліцу Ніжнепакроўскую.

Вось перад намі банк. Ён прадстаўлены вялізным фотаздымкам, узорамі грошай і рознымі банкаўскімі дакументамі.

З банка мы трапляем у бакалейную лаўку. Стол, паліцы з таварамі, рэклама гарэлкі на сцяне, бязмены, мяхі з зернем –усё гэта ствярае ўражанне сапраўднай лаўкі. Пасля бакалейнай лаўкі трапляем у трактыр. Тут мы бачым стол, накрыты чысцюткім белым абрусам (абрус сапраўдны ХУІІІ ст.), на стале шклянкі з гарбатай, цукар, абаранкі. У куце стаіць самавар, на паліцах посуд, каля акна вялізны грамафон.

Насупраць трактыра знаходзіцца аптэка, шафа з замкнёнымі дзверцамі, у шафе розныя бутэлечкі і флакончыкі з-пад лекаў. Гадзіннік у куце паказвае дакладны час, на стале розныя рэцэпты, разгорнуты медычна часопіс. Здаецца, што гаспадар толькі выйшаў з пакоя.

Пасля аптэкі мінаем жаночую гімназію і бачым апошні дом у экспазіцыі. Гэта дом гарадскога галавы. Ён добра захаваўся да нашага часу.

Так скончылася наша пагулянка па Ніжнепакроўскай. Увогуле, уся выстава пакінула вельмі прыемныя ўражанні, чаму садзейнічала ветлівасць і ўважлівае стаўленне музейнай супрацоўніцы (на жаль, мы не спыталі яе імя), за што мы ёй вельмі ўдзячныя. Яна вельмі шчыра паставілася да нас, распавяла пра выставу, адказала на ўсе нашыя пытанні, а калі даведалася, што мы з Менску, растлумачыла, дзе што знаходзіцца ў Полацку і як туды лепей трапіць. Было вельмі прыемна адчуць такую павагу да наведвальнікаў.

Савіцкі Глеб, студэнт БУК.

"Легенда з пяску"

У 2000 годзе спаўняецца роўна 1000 гадоў, як заснула вечным сном княгіня Рагнеда. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" плануе адзначыць гэту дату скульптурным пленэрам "Легенда з пяску".

Сотні пакаленняў данеслі да нас адно, легенду пра яе. І вось на ўскрайку Заслаўя ў пясочных кар'ерах чатыры дзесяткі юных разьбяроў пад кіраўніцтвам Генадзя Лойкі дадуць убачыць усім Рагнеду 1000 гадоў таму.

За тры дні мяркуецца стварыць з пяску выяву князёўны ў сорак метраў даўжыней.

"Заслаўе" прапануе ўсім жадаючым прыняць удзел у гэтай гістарычнай падзеі.

У праграме пленэра выступленне беларускіх бардаў і іншых цікавых асоб.

Мяркуецца магчымасць убачыць і зафіксаваць Рагнеду на фота з вышыні птушынага палёту.

Урачыстае адкрыццё першага ў Беларусі скульптурнага пленэру "Легенда з пяску" адбудзецца а 15-й гадзіне 2 ліпеня ў Заслаўі (у кар'ерах, што за вёскай Кладачкі).

З Менску адпраўленне з чыгуначнага вакзала да станцыі Беларусь, Маладзечанскага напрамку.

Даведкі па тэл.: 544-11-70

Алесь Гурыновіч

Алесь Петрашкевіч

ПРАГНОЗ НА ПАСЛЯЗАЎТРА

(Фарс у дзвюх дзеях)

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

Сапежанка. Слова даецца абаронцу падсуднага, адвакату Касцюшку.

Касцюшка. Паважаная старшыня суда! Шаноўныя спадары і спадарыні прысяжныя засядацелі! Ды будзе мне дазволена з гэтай трыбуны выказаць глыбокі чалавечы смутак і спачуванне баявым сябрам і паплечнікам Авангарда Батыевича. Я выказаў бы спачуванні родным і блізкім нябожчыка, аднак у сваёй старасці ён аказаўся зусім адзінокім... Я спадзяюся, што не абражу нічыіх пачуццяў тым, што, абапіраючыся на абставіны смерці, абараняючы Кастуся Каліноўскага, бо менавіта гэтыя абставіны глыбока пераконваюць мяне ў тым, што ён не забіваў Иванова-Чингизханова, і тым больш наўмысна, і тым больш у палітычных мэтах "на почве мести общественному деятелю", як сцвярджае дзяржаўны абвінаваўца.

Суворов (крычыць). Фарисей!

Сапежанка звоніць у званочак.

Касцюшка. З фарысейства і пачнем... Усе, хто ведае пракурора Муравьёва, напэўна і чакалі ад яго прамовы яраснай і наступальнай. І ў гэтым няма нічога дзіўнага ці нечаканага. Ёсць такое права ў дзяржаўнага абвінаваўцы. Мяне насцярожыла і нават збянтэжыла іншае. Навошта раптам пракурору спатрэбілася для заключнай часткі сваёй прамовы, а ён чытаў яе з паперкі, красці не толькі грозныя словы, не толькі паасобныя сказы, а цалкам усю ўступную частку прамовы пана Джэксана – галоўнага абвінаваўцы ад ЗША на Нюрнбергскім працэсе над ваеннымі злачынцамі. Таварыш пракурор так захапіўся крадзяжом чужога, што нават не стаў у ім нічога правіць, каб зрабіць сваім.

Муравьёв. Я попросил бы подбирать выражения!

Сапежанка звоніць у званочак.

Касцюшка. Толькі множны лік ваенных злачынцаў замяніў адзіночным лікам майго падабароннага. Менавіта з гэтай прычыны перад намі замест ахвяры савецкай партыйна-палітычнай прадузятасці і беззаконня з'явіўся радыкальны, махровы цемрашал-нацыяналіст, нацыянал-фашыст і нават "символ расовой ненависти, террора и насилия". Сімвал "интриг и провокаций, которые могут подвергнуть наше общество в кровавый кошмар". Канец цытаты па пану Джэксану.

Абвінаваўца па-майстэрску выкарыстаў запазычанае ў пана Джэксана і вельмі лоўка спрацэцыраваў і ўвязаў філасофію і ідэі нямецкіх нацыянал-сацыялістаў з ідэяй нацыянальнага адраджэння нашай краіны. Пры гэтым так сам перапалохаўся ўяўнага нацызму, што ад імя ўсёй сусветнай цывілізацыі запатрабаваў смяротнай кары для майго падабароннага.

Я пытаюся ў сябе і ў вас, шаноўныя суддзі: што гэта?! Бездапаможнасць абвінаваўцы перад сілай фактаў?! Правакацыя супраць дэмакратычнага руху на Беларусі і патугі надаць фактычна справакаванаму працэсу палітычны характар?! Ці, можа, прэтэнзія на першынства ў адкрыцці чарговага паляўнічага сезону на "адстрэл ведзьмаў" і пачатак масавых рэпрэсій супраць таго жывога, што яшчэ засталося, ацалела на нашай зямлі?!

Я не думаю, што гэта звычайны непрафісіяналізм служкі пані Феміды.

Муравьёв. Я – прокурор, а не "служка ў пані"!

Сапежанка. Спа-кой-на!

Касцюшка. Скажу шчыра, абвінаваўчая прамова "товарища Муравьёва" нагадала мне знакамітыя "обвинительные речи товарища Вышинского" і іншых карыфеяў савецкай юрыдычнай тэорыі і практыкі першай паловы XX стагоддзя, вынікамі якой былі рэкі крыві мільёнаў нявінных людзей.

Мурвьёв (вельмі рашуча). Я протестую!.. Я протестую и требую поставить адвоката в рамки закона!..

Сапежанка. Пважаны абвінаваўца, калі Вы выступалі і не горш за адваката, я Вас не перапыняла. Вас жа, паважаны абаронца, папрашу не адхіляцца ад асноўнага аб'екта абарончай прамовы.

Касцюшка. Якраз да яго мы і звернемся... Я перакананы, што апраўданню Кастуся Каліноўскага, як ні дзіўна гэта можа паказацца, у значнай меры паспрыяе эмацыянальная, энергічная і ў вышэйшай ступені бескампрамісная і надта ж не карэктная прамова абвінаваўцы. Дзіўна, але пракурор нават не імкнуўся выкрыць канкрэтнае злачынства і злачынцу, аналізуючы матэрыялы справы, супастаўляючы доказы сведкаў, эксперта, урэшце, самога падсуднага. Ён. як і ўсе заўважылі, у асноўным лаяўся і кляйміў майго падабароннага. Вядома, гэта рабіць не складана, але ж гэтага не дастаткова для вынясення не толькі смяротнага, але і ўсякага іншага прысуду.

Некалі вядомы адвакат Коні казаў: "Пройтись за счёт подсудимого, без сомнения, иногда бывает соблазнительно, особенно в тех случаях, когда обвинитель глубоко убеждён в его виновности и возмущён его поведением... Но этому соблазну не следует поддаваться". А ў нашым выпадку наогул нейкі парадокс. У мяне такое ўражане, што пракурор зусім не перакананы ў вінаватасці падсуднага. З нейчага блаславення ён імкнуўся надаць працэсу палітычны характар і з гэтае прычыны забыўся на ўсё іншае.

Даруйце, спадар Муравьёв, але такая заангажаванасць пракурора...

Муравьёв (ускоквае з-за стала). Я протестую! Я возмущён и оскорблен такими заявлениями адвоката! И требую извинений!..

Касцюшка. Калі паважаны абвінаваўца так хваравіта ўспрыняў мае словы, я прыношу яму свае прабачэнні. Але ж факты...

Сапежанка. Калі паважаны абаронца не пяройдзе да аналізу тых самых фактаў, пра якія так правільна гаворыць, яго прамова нічым не будзе адрозніваца ад прамовы паважанага дзяржаўнага абвінаваўцы, якой бы якасці апошняя ні была.

Касцюшка. У такім разе звернемся да фактаў, якія абвінаваўца не даказаў, абышоў ці замоўчаў. Не даказаў: ці ўдзельнічаў мой падабаронны ў сутычцы "чырвоназялёных" з "бел-чырвона-белымі", ці быў знаёмы з пацярпелым; ці меў намер забіваць яго, як грамадскага дзеяча. Не высветліў: чаму падсудны не збег з месца злачынства, а выклікаў хуткую дапамогу; чаму сведкі Халуевіч і Козолупова далі такія процілеглыя паказанні; чаму не быў праведзены следчы эксперымент; куды дзелася ручка ад куфля; чаму так паспешліва крэміравалі пацярпелага. Пракурор абышоў, замоўчаў заяву падсуднага аб тым, што яго збівалі ў камеры папярэдняга зняволення, аб чым ён падаваў скаргу на імя таго ж пракурора! У пракурора нават не выклікаў цікавасці той факт, што следчы не апісаў месца здарэння, на якім мог быць камень, цагліна, і да гэтага часу ёсць прыступкі ў бар, аб якія пацярпелы мог ударыцца пры падзенні. Піўная стойка і зараз размешчана каля гэтых прыступак.

І апошняе... Чаму пры ўсім пры гэтым дзяржаўны абвінаваўца не адмовіўся ад абвінавачвання, калі яго штучная схема развалілася, калі сфабрыкаваная справа рассыпалася? Чаму ён так пасіўна вёў сябе ў час допыту сведак? Можа па той прычыне, што не хацеў пачуць ад іх тое, што яны маглі сказаць на карысць падсуднага.

А што, як сведка Козалупова сапраўды сумленная, дзелавая і разважлівая жанчына, якая ўсё пралічыла і ўзважыла, чым могуць скончыцца яе несумленныя паводзіны ў судзе? І чаму пракурор так упэўнены ў тым, што прадстаўнік пацярпелага Суворов не даваў хабар Козалуповой, не купляў яе загадзя ілжывыя паказанні? А калі няўпэўнены, то дзе тыя юрыдычныя захады, якія б знялі падазрэнні?

Пытанні! Пытанні! Пытанні! Да таго ж невысветленыя. І яны, як мне здаецца, даюць падставы суду пераканацца ў тым, што нескаму патрэбен быў "забойца" ветэрана ды яшчэ пры выкананні грамадскіх абавязкаў. Ахвярай палітычных інтрыг і злачынных паводзін пракурорска-следчай службы і стаў мой падабаронны, віна якога не была даказана, што дае падставу суду прысяжных вынесці вердыкт аб яго поўнай невінаватасці.

Я скончыў, паважаныя суддзі і прысяжныя засядацелі.

Сапежанка. Сядайце... Дзяржаўны абвінаваўца мае права на рэпліку...

Муравьёв. Было бы унизительным вступать в полемику после столь безответственного выступления адвоката!

Сапежанка. Падсудны, устаньце. Суд прадстаўляе вам права на апошняе слова.

Каліноўскі ўстае і доўга маўчыць.

Вы мяне не зразумелі, падсудны?

Каліноўскі (ціха нават прыгнечана). Не забіваў я таго няшчаснага старога. Няма на мне граху за яго, не будзе і пакаяння ні перад судом, ні нават перад Госпадам Богам. *(Узвышае голас.)* У іншым я каюся. І асуджэння заслугоўваю, як і ўвесь мой няшчасны народ – за шматвяковую быдлячую цярплівасць, абыякавасць да свайго лёсу, сваёй зямлі, сваёй гісторыі, сваёй мовы і культуры; за ніпаціленне таму гвалту, што чыняць на нашай зямлі спрадвеку і да сённяшняга нахабнікі, набежнікі, чужыя і свае прайдзісветы, авантурысты, зладзюгі і тыя браты нашы, якім косткаю ў горле наша воля, чалавечая годнасць і нацыянальны грамадскі гонар.

Пасядзеўшы ў турме і ў гэтай клетцы, пабачыўшы ваш "шамякін суд", мяркую, што вынесеце вы мне смяротны прысуд ні за што, ні пра што. А інакш, хто б вас тут трымаў і ўтрымліваў. Добра, калі там, у няволі, застрэляць хутка і адразу. Горш, калі згнояць у турме ці замардуюць на катарзе, як згнаілі і замардавалі мільёны з майго народа.

Ці пашкадую перад смерцю сябе і свой народзец?.. Наўрад ці... І шкадаваць і ратаваць сябе і яго трэба было намнога раней. Вы кажаце, што мне 27?! А што зрабіў я ў свае 27?! Гадамі хадзіў на мітынгі і вагаўся, як той на кучы, - вырашаў, да каго далучыцца. А народзец тым часам краў, піў, марнеў, дзічэў і пакрысе выміраў, асабліва пасля Чарнобыля, - без веры, без надзеі, без маралі, без гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці.

Не, не пашкадую, бо няма за што.

Ці пашкадую дзяржаву, якая не плоціць сваім грамадзянам за работу, якая кінула сваіх старых на волю лёсу, а маладымі запрудзіла турмы; якая ўблытваецца ў ваенныя саюзы, каб гаціць чужую прорву вайны сваімі сынамі. А хіба варта жалю грамадства, што як старая шлюха прадаецца ў няволю, адракаючыся пры гэтым і ад сваіх багоў, і ад сваіх сімвалаў; Грамадства, у якім незапатрабавальныя застаюцца таленты, розум і майстэрства; у якім забараняецца свабода слова, утоптваецца ў гразь незалежнасць і канстытуцыя, што яе дэкларавала.

Не пашкадую, бо не заслугоўвае ні жалю, ні павагі.

Муравьёв (да Сапежанкі). Может быть, вы попросили бы подсудимого позаботиться о себе, а не о державе и "грамадстве".

Каліноўскі. Што ж вы мяне перапыняеце, калі самі арганізавалі гэты працэс менавіта для таго, каб пачуць ад мяне, на чым стаяць і чаго хочуць такія ненавісны вам дэмакраты. *(Паўза).*

Сапежанка. Прадаўжайце падсудны.

Каліноўскі. Як ні горка казаць, але і з маёю жаласцю і без яе знікае з твару зямлі і такі народ, і такая дзяржава, у якой прыватызуецца не цырульня і пральня, а палітычная і эканамічная ўлада; у якой нацыянальна свядомыя людзі з'яўляюцца нацыянальнай меншасцю; у якой амаль немагчыма знайсці садок ці клас, у якім бы выхоўвалі і навучалі на нацыянальнай, дарэчы, дзяржаўнай мове; дзяржава, у якой слова "патрыёт" атаясамліваецца са словам "нацыяналіст", а слова "нацыяналіст" з'яўляецца лаянкай і палітычным ярлыком; у якой пракурор, не даказаўшы злачынства, патрабуе смяротнай кары сваёй ахвяры і лепіць да яе цытаты, украдзеныя з абвінаваўчай прамовы на Нюрнбергскім працэсе!

Скажыце, дзе яшчэ такое можна пабачыць?! Толькі ў нашым запаведніку, у нашай Вандэі, толькі ў той дзяржаве, дзе "кухаркамі" кіруюць такія ж "кухары" па ўзроўню свядомасці. Дзе яшчэ прыблуда з свету можа запатрабаваць ад карэннага жыхара: "говорите на человеческом языке?!" Дзе яшчэ абруселыя абарыгены адхрышчваюцца ад сваёй гісторыі і забараняюць "нацыоналістические" падручнікі і вяртаюцца да старых савецкіх інтэрнацыянальных?! Назавіце мне народ, які бы не ведаў сваіх каранёў і танцаваў на могілках сваіх продкаў?! І на што можа спадзявацца народ не аб'ядняны агульнай гістарычнай памяццю, агульнай мовай і нацыянальнай свядомасцю, народ, які не ўцяміў сваіх геапалітычных інтарэсаў.

Толькі ў нас і нідзе болей сіроцтва пастаўлена на патрок! Толькі ў нас і нідзе яшчэ меней нараджаецца, чым паміраe! Толькі ў нас з блаславення ўлады п'янства стала стыхійным бедствам, а самагубствы звычайнай з'явай! Толькі нашы абалваненыя і замбіраваныя афіцыйнай дэмагогіяй людзі гатовы ісці за любым прайдзісветам, які паабяцае простае выйсце са складанага становішча.

І апошняе. Народ, які не запатрабаваў да гэтага часу свайго Майсея, які дапамог бы яму знішчыць раба ў сабе, будзе мадзець так, як і належыць мадзець рабам. Адзіная ўцеха, што сёння ўжо многія мае суайчыннікі з годнасцю і гонарам могуць заявіць і заяўляюць: рабы не мы, мы не рабы! Мы не калоніі!

Я скончыў, "господа-товарищи" прысяжныя засядацелі. Выносце свой справядлівы вердыкт не сумняшася. Ад гэтай мінуты і да смерці я не ваш! *(Садзіцца).*

(Працяг у наступным нумары.)

Юры Карэйва

“ХАЙ СТАНЕ МАЛЕННЕМ ВЕРШ!..”

(Заканчэнне. Пачатак у папярэднім нумары).

Зьніч распавядае, што менавіта бацька, які, здавалася, знешне амаль ніяк не праяўляў нацыянальнай свядомасці і карыстаўся роднай мовай у выглядзе асобных слоў і выразаў, ды і то толькі зрэдзьчас і прынагодна (у сям'і іхняй беларускамоўнаю была толькі бабуля Хрысціна; памерла ў 1962 г.), параіў яму, згодна з прапановаю праф. Казіміра Буслава, тэмай дысертацыі ўзяць праблему нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў музычнай культуры, а дакладна – у культуры музычнай беларускай. Заўважыў пры гэтым, што такую тэму па-сапраўднаму можна раскрыць толькі на беларускай мове.

Тады ж, сустрэўшы свайго навуковага кіраўніка – знакамітага праф. сп. Уладзіміра Конана, Алег адчуў сябе ў абсалютным сэнсе “нацыянальна блудным сынам”, адчуў сапраўдны цяжкі грэх перад Богам і Бацькаўшчынай і “сорам за сябе”.

Адбылося нацыянальнае пакаянне: праца над дысертацыяй на беларускай мове, пераход да поўнага і заўсёднапаўсядзённага карыстання роднай мовай...

5.

Перад слухачамі ў стоена-сцішанай зале гучыць шчыры, як споведзь расповед пра тое, як няпроста ўсё гэта было ўспрынята ў тагачасных грамадскіх колах.

Такі раптоўна-нечаканы яго пераход на беларускае маўленне ў сям'і кваліфікаваўся як чарговае яго “юродства”. Ды з часам сямейнікі да гэтага “юродства” прызвычаіліся, а нават казалі Алегу, што ў яго “это не плохо получается”, што гэта “даже красиво” і што, калі б яны так умелі, дык “тоже охотно бы говорили”.

Хоць у сям'і яго і сярод бальшыні знаёмых так і засталося “самотным ляманта́м у пустыні”, усё ж яно прынесла свайму непахісніку шчодравялікі плён: творчае высоканатхнёнае мастацка-філасофскае асэнсаванне і асваенне створанага Богам быцця. Канкрэтызацыя досведу аб гэтым быцці – у разуменні нацыянальнай ідэі, у непрыняцці датычна яе штучнавынайдзеных тэзаў аб нібыта канфліктнасці і супярэчлівасці нацыянальнага і рэлігійнага.

“У хрысціяніна такая супярэчлівасць у прынцыпе не магчлівая”, - сцвярджае брат Алег і падмацоўвае сваю думку евангелічным: “Няма ўжо ні Эліна ні Іудзея, ні раба, ні свабоднага – бо ўсе вы – адно – у Хрысце Ісусе..”. Гэта – на ўсе часы і для ўсіх плямёнаў катэгарычны імператыў Госпада. Таму што: “Усе плямёны – Божыя стварэнні. Як дзеткі Хрыстовай сям'і, яны павінны жыць дружалюбна, не крыўдзіць адзін аднаго і слухаць свайго Бацьку Нябеснага. Быць “кроткімі і змірэннымі сэрцам” – як сам Хрыстос. Тады і канфліктаў і супярэчнасцяў вялікіх не будзе. Тады ў кожным пытанні, цярпенні, малітве ды пакаянні, ды ў любові да ворагаў, якую запаведаў нам Гасподзь Ісус Хрыстос, можна будзе памеркавацца ...” (цытата слоў брата Алега, якія ён зачытвае да прысутных; з інтэрвію, узятага ў яго Юрасём Залоскам; тут і далей усе вытрымкі з час. “Крыніца” №9 (1999г., -Ю.К.)

6.

Зьніч адказвае на пытанне, хто быў яго галоўным настаўнікам, цераз якога ён прыйшоў да веры ў Бога.

Ён распавядае, што сапраўднаю верніцай у іх сям'і была цётачка Анастасія – Анастасся Анатольеўна Дзядок, родная сястра яго маці, скульптара Вольгі Анатольеўны. З ёю ён з дзяцінства “вельмі любіў сумовіцца”. Яна і была “тою жывою нітачкай”, што звязала яго з “Божым Промыслам”.

Гэта пра яе – пеўныя шчырае ўдзячнасці, кранальна-пранікнёныя паэтычныя радкі:

... хто - у бязбежнае стыхіі
мяне з маленства ў Храм гукаў?..
цярпліва песціў і ... чакаў?.. –
то цётачка Анастасія.

Яна, выкладчыца дзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы – Менскага інстытута культуры, ніколькі не баючыся карных санкцый з боку ўлад, адкрыта наведвала царкву.

Лічыла справядлівым папушчэннем Госпадам бунтаў і рэвалюцый за тое, што багатыя цяжка грашылі – не шкадавалі бедных і бязбожна абыходзіліся са сваім багаццем, лічыла атэізм “заблуджэннем”, ад якога грамадства ўсё ж вызваліцца.

Менавіта яна, цётачка Анастасія, пазнаёміла 17-цігадовага Алега з творчасцю Ф. Дастаеўскага, даўшы прачытаць ягоны раман “Браты Карамазавы”.. Вобраз Алёшы Карамазава і Вялікага інквізітара вызначылі ўсе яго далейшыя жыццёвыя пошукі і памкненні.

7.

На некалькі пытанняў, якія датычаць непасрэдна самой Царквы, сучаснага становішча чалавека ў ейных межах ды паза ёю, суадносінаў хрысціянства і антыхрысціянскіх памкненняў у сённяшнім свеце, брат Алег адказаў, што

... існуе “векавечны, асвечаны Царквой, Праваслаўны лад жыцця, - калі сямейныя традыцыі і законы дзяржавы заснаваных на Запаведзях Божых”, што

... у пошуках скіраванасці сэрцаў і “вектара грамадскага актывізму” кожная новая душа, якая свабоднаю воляю вызначаецца ў свеце, мусіць памятаць наступнае: першы мэта-гістарычны, а потым і гістарычны бунтаўшчык і рэвалюцыянер, змагар за поўную свабоду: незалежнасць ад Боганатхнёнае гармоніі існага і Праваслаўнага ладу жыцця на зямлі, Святаайчыннага Царкоўнага Камертона, - гэта вораг роду чалавечага. Іншых ворагаў у нас няма – ні на зямлі, ні ў Сусвеце; ён, - гэты сапраўдны ініцыятар усёй гераічнай гісторыі, усіх бунтаў, рэвалюцый, паўстанняў за народнае і ўсялюдскае шчасце, свабоду, народную ўладу... добра ведаў і ведае, супраць Каго і Чыёй Улады ён змагаецца, каго распальвае ды ўцягвае у свае векавыя тайны “беззаконня”. Але ці ж ведаюць гэта тыя, каго ён уводзіць у спакушэнні ды чары? Свядомыя антыхрысты, відаць па ўсім, ведаюць. А тыя, хто нібыта ўяўляюць сябе хрысціянамі?..”

8.

Наконт жа нашых усё ж вартых жалю і хрысціянскай міласэрнасці неразумных братоў-палітыкаў і братоў-палітыканаў (“прафесіяналаў” і “аматараў”) брат Алег заўважае, што раіў бы ім сысці хаця б на год у послух у манастыры, а лепш – у Жыровіцкую абіцель, тады б мо ім шмат што праяснілася: за што яны бяруцца, не спытаўшы на тое Богавага блаславення, не атрымаўшы уцаркаўлення, і не думаючы, што чакае іх і “малых сіх”, якіх яны спакушаюць.

І вось, падараваўшы па асобніку аднаго з нумароў Багаслоўска-літаратурна-мастацкага лістка “Жыровіцкая Абіцель”, ён сардэчна запрашае нас наведаць святыя ейныя муры.

9.

Яшчэ ў пачатку нашае сустрэчы на пытанне, чаму ў праваслаўнай беларускамоўнай традыцыі ўжываецца слова “благадаць”, першая частка якога ў нашай мове ёсць сінонімам слова “дрэнна”, брат Алег давёў, што яно не павінна нас бянтэжыць, бо словы гэтае паводле свайго паходжання агульна- і старажытнаславянскае. Патлумачыў, што (Б)**лагода**(ть) Божая на Беларусі – фундаментальная рыса нашага нацыянальнага характару, і што нібыта глыбокаўкарэненае ў паганства, язычкасць не ёсць нашай ледзь ні галоўнай рысай, ці – адметнасцю, як гэта часам сцвярджаецца “знаўцамі” гэтага пытання. Наадварот, Беларусі найбольш уласцівая якраз хрысціянскасць: “Беларусь у гэтай **лагодзе**, нязможнай любові да ворагаў, праз самыя лютыя выпрабаванні і цяжкія спакушэнні ніколі не стане падобнай да тых краін, у якіх пануе імкненне да бунту (г.зн. – рэвалюцыйна разлагоджваць свет – Ю.К.) у гэтым – мэта-гістарычная і сусветнагістарычная місія нашай Бацькаўшчыны”.

Такое вось сумоўе.

На заканчэнне гучыць на фартэпіяна “Саната поўні” Л.В. Бетховена ды яшчэ раз “сугучныя” ёй радкі верша “Хрыстос уваскрэсе!..”, якімі і пачыналася паэтычна-музычная кампазіцыя сучаснага паэта-філосафа і падзвіжніка, прадаўжальніка хрысціянскіх асветніцкіх традыцый слаўных Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Аўрамія Смаленскага, Анастасіі-Рагнеды, Францішка Скарыны і іншых нашых Вялікіх Настаўнікаў і Выхавацеляў у веры і Вучэнні Госпада Ісуса Хрыста.

Сумоўе скончылася?.. –

Сумоўе прадаўжаецца!

А каб доўжыцца яму і надалей, пастараемся ж часцей звяртацца да Боганатхнёнай Паэзіі нашага суайчынніка і брата, які абраўшы сабе за Шлях і Мэту служэнне Богу, а тым самым і – служэнне нам з вамі, прыйшоў у сваіх паэтычна-філасофскіх разважаннях да абсалютна яснай для сябе жыццёвай высновы:

... Зямную сцяжыну завершы
раскаяным сэрцам найперш...
... Маленні – вышэй за вершы,
Хай стане маленнем верш!..

І сапраўды:

... Вечнасць абрала
Племя... і Час...
Шлях... і Аблічча...
І Слова...
Каб прытуліцца да кожнага з нас
Духам
І Целам
Хрыстовым.

P.S. ужо калі скончылася гэтая амаль трохгадзінная сустрэча і мы прапанавалі брату Алегу паставіць свой подпіс за адкрыццё Беларускага Нацыянальнага Універсітэта імя Францішка Багушэвіча ў Лідзе, ён, шчыра зацікавіўшыся гэтай ідэяй, доўга распытваў нас аб канцэпцыі Універсітэта. У прыватнасці, цікавіўся аб філасофска-багаслоўскім факультэце, выкладчыцкім складзе будучай навучальнай установы, прыгадаў сярод тых, з кім асабіста знаёмы, і са словамі “Бог у помач” блаславіў нашу справу сваім подпісам, але заўважыў пры гэтым, што са словаў у падпісным лісце ***“патрабуем”*** і ***“просім”*** усё ж і першае з іх павінна быць таксама ***“просім”*** (закрэсліўшы, выправіў яго) і параіў ва ўсіх справах кіравацца словамі Хрыста: “Прасеце – і дасцца вам”.

г. Ліда



МОЙ КРАЙ

...каля паўтары сотні манастыроў –
вялікіх, меньшых і зусім маленькіх –
было ў Беларусі на пачатку XX ст.
(Зь гісторыка-статыстычных апісаньняў
Беларускіх Епархіяў).

...намоленыя, чыстыя мясьціны -
пакрылі богаборныя віры:
ў гісторыю сышлі манастыры -
апора Праваслаўнае Айчыны...

...і процьмы душ
у ганьбе запусьценьня
блукаюць – не чужыя й не свае...
заблудная краіна йшчэ жыве
бясконцасьцю Господняга цярпеньня...

...але матыў ВЯРТАНЬНЯ
блудным сынам
пачуецца, калі наўкол – абрыў...
як сонейка – ізноў манастыры
ўзыдуць над Праваслаўнаю Айчынай!..

... памілуй, Хрысьце, памілуй
нябожчыкаў і жывых...
і дай нам усім сьцяжыны
ў бясконцых Шляхох Тваіх ...

СХІМНІКАМ

...вас спакушае цэсар -
разбэшчанай д'ябальскай думкай ...
і дабрабытам...
і чымсьці толькі яшчэ...
а вы трымаеце
сэрца гісторыі духа...
Боскай Самотай
сьпеў ваш
па жылах сусьвету
цячэ
Хрыстос нараджаецца!.. -
хутка двухтысячны раз...
Хрыстос нараджаецца
ў сэрцах зьмірэнных бясконца...
як неадступна ўліваецца золата сонца
ў хмарны
панурыя
разбойны
і зьменлівы час ...

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 23. 06. 2000 г.
Наклад 3200 асобнікаў. Замова № 1685
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 147 руб., 3 мес.- 441 руб.
Кошт у розніцу: 35 руб.